# Усталюй свой помнік

Ідэі і прапановы, мроі і мары
ад Мінскага экспертнага клуба
“Город дорог”

## Сяргей Харэўскі: "Ab ovo".

У Мінску, у адрозьненьні ад усіх суседзяў, няма помнікаў першаму князю горада (у нашым выпадку -- Глебу). Дзіўна, але дасёньня няма манумэнта ў памяць пра сечу на Нямізе!

Фактычна няма помніка і легендарнаму заснавальніку -- Мянеску (кампазіцыя на Камсамольскім возеры, відавочна малапрыкметная, аддаленая й далёка не вычэрпывае ўсяго вялізарнага патэнцыялу вобраза).

Тое ж тычыцца й кампазіцыі, прысьвечанай абразу Маці Божае Мінскае, якая стала гэрбам горада на вул. Зыбіцкай.

Параўнайце з помнікамі



## Сяргей Харэўскі:
## "Ab ovo".

Няма помніка й Святому Фэліцыяну Італійскаму -- хрысьціянскаму патрону нашага горада, чые рэліквіі зберагаліся ў катэральным саборы і ў гонар якога была названая вуліца. Напрыклад, у Вільні сама меней чатыры помніка Святому Хрыстафору, розных эпохаў, які лічыцца іхным заступнікам і ўпрыгожвае гарадскі герб.

Хацелася б бачыць і помнік паэту-вяшчуну Баяну, пра якога ў тутэйшай традыцыі было ўстаялвана трывалае меркаванне, што ён жыў менавіта ў нашым горадзе. Паколькі гэтая постаць паўлегендарная, збіральны вобраз, то мы цалкам справядліва маглі бы паставіць помнік "славянскаму Гамэру" і ў нас!

Неабходна ўшанаваць памяць пра самую славутую ў колішнім сьвеце дзяўчыну зь Менску -- князёўну Соф'ю Валадараўну Менскую, каралеву Даніі, чые дзеці занялі ажно 5 каралеўскі і княскіх пасадаў Еўропы!



# Кастусь Шастоўскі: помнікі страчаным храмам.

«…Я бы паставіў помнікі страчаным храмам у выглядзе іх паменшаных копій на тым месцы (побач), дзе яны стаялі. Як мінімум тры аб'екты, якія вартыя таго - Халодная сінагога, касцёл Святога Тамаша Аквінскага, касцёл Святога Войцэха. Грошаў трэба няшмат, а месца актуалізаваць можна. Прыкладна, як у Любліне…».



# Міхаіл Валодзін: помнік доктару Вільгельму Гіндэнбургу

**Доктар Гіндэнбург нарадзіўся ў Мінску ў 1799, ачольваў Мінскае медыцынскае таварыства. Акушэр Мінскае лекарскае ўправы, галоўны турэмны лекар.**

**Памёр у 1877, пахаваны на мінскіх лютэранскіх могілках. Прыклад: кенатаф адмірала Ф. Белінсгаўзэна на лютэранскіх могілках у Кранштаце.**





# Уладзімір Валожынскі: Першая аўтамабільная аварыя Ў Менску.

У гэтым годзе - 110 гадоў з дня першай аўтамабільнай аварыі ў Менску. Нагадаю:"1906 г. некто Иван Федоров получил разрешение городской управы на пассажирские перевозки. Первый выход шестиместного "Мерседеса" на улицы Минска состоялся 20 августа. Эта поездка закончилась аварией, причем один из пассажиров погиб. После этого инцидента городские власти на целых шесть лет запретили использовать автомобиль для коммерческой перевозки пассажиров".

- Першая аўтамабільная аварыя на тэрыторыі Мінска
- Адна з мадэляў аўтамабіля «Мэрсэдэс» пачатку XX стагоддзя
- 12 жніўня 1906 г. зараджалася аўтамабілізму ў Беларусі
- Малая архітэктурная форма
- На месцы аварыі - на скрыжаванні сучасных вуліц К.Маркса і Я.Купалы
- Зламаны ў аварыі аўтамабіль з кіроўцам і пасажырамі ў салоне. Тэкст, што-то тыпу: «На гэтым месцы 12 жніўня 1906 года адбылася першая ў горадзе аўтамабільная аварыя. Калі б гэтая кампазіцыя паслужыць напамін усім тым, хто знаходзіцца за рулём ці яшчэ збіраецца стаць вадзіцелем »
- У горадзе няма помнікаў (скульптур), звязаных з «уваходжаннем у паўсядзённае жыццё» дасягненняў тэхнікі. А таксама нагадваюць людзям пра патэнцыйную небяспеку навуковых і тэхнічных дасягненняў, аб адказнасці за чалавечыя жыцці.



# Павел Вайніцкі:
# два неабходных помніка.

**Каралю Яну Аляксандру Чапскаму- самому эфектыўнаму нашаму мэру, які шмат зрабіў для горада на мяжы XIX і XX стагоддзяў**




**Іосіфу Лангбарду - архітэктару, у сваіх мадэрнісцкіх будынках (Дом урада, Оперны, Акадэмія Навук, Палац афіцэраў) заклаў падставы сучаснага Мінска.**



# Віктар Капыцька: помнік кампазітарам Тэраўскаму і Рак-Міхайлоўскаму

**Дзвухфігурны помнік ці бюст (барэльеф і да т.п.) двум кампазітарам. Абодва стварылі па шэдэўру, якія сталі сапраўды народнымі песнямі:**



**Тэраўскі напісаў "Купалінку", а Рак-Міхайлоўскі "Зорку Венеру". Абодва былі расстраляныя ў 1938 года ў Мінску.**



# Мэмарыяльны знак “Синий платочек»

**Будынак, у якім кампазітар Ежы Пецярбуржскі ў 1940 напісаў музыку да будучай песні.**



**Эскіз мэмарыльнага знака, у памяць пра стварэнне мэлодыі,  скульптара Паўла Вайніцкага.**



# Уладзімір Сцяпан: помнік мастаку-настаўніку.

Уладзімір Сцяпан: “Мне б хацелася каб у Мінску, на вуліцы Кірава, побач з Палацам піянераў стаяў помнік мастаку-педагогу Сяргею Пятровічу Каткову і яго вучням-мастакам: Стэльмашонку, Левіну, Данцыгу, Забораву, Літвінавай, Катковай, Хацкевічу, Сазыкінай, Адамчыку, Задорыну, Заслонаву...».

Кастусь Шастоўскі: “А вось і помнік. Сяргей Пятровіч Каткоў з дзецьмі. Масква, канал імя Масквы, чэрвень 1950 г. Вандроўка для пераможцаў рэспубліканскага дзіцячага конкурсу.”. Фота з архіву К. Шастоўскага



# Аляксандр Фядута: помнік актрысам Макаравай і Станюце.

**«У кіеўскім скверы каля тэатра імя Івана Франка два помнікі двум выбітным акцёрам - Гнату Юру і Мікалаю Яковченко…».**



**«…Мне здаецца, у скверы каля тэатра імя Янкі Купалы можна паставіць лаву і пасадзіць на яе адпачывальнікамі пасля спектакля Галіну Макараву і Стэфанію Станюту, якія адпачываюць пасля спектакля. Гэта будзе слушна!»…**



# Генік Лойка: помнік Купалавай паэме “На Куцьцю”

**Гэта будзе беларускамоўны помнік Паэме. Паэме Янкі Купалы "На Куцьцю". Помнік "Тром Ганцам", альбо іначай глянуўшы, помнік "Князю і Княжне". Якім Князю і Княжне? А гэта ўжо вызначыць любая пара закаханых ці сужэнцаў, надаўшы Князю і княжне свае ўласныя імёны і падставіўшы свае ўласныя постаці пад залатыя княскія кароны. Такім чынам любая пара менчукоў ці турыстаў зможа стаць на момант (момант бліскавіцы фотаапарата) Князем і Княжнай.**
**Сілуэт у скульптуры -- знаходка ня новая. Тым ня менш, гэты помнік ня можа паставіць сабе аніводзін народ, бо ніхто ня мае такога Купалы і такой паэмы. Толькі тут, у Беларусі, у сталіцы Беларусі, нават у самым сэрцы сталіцы Беларусі! Мейсца падказвае сама паэма -- на замчышчы, на папялішчы. Старажытны Менск у пэўным сэнсе суцэльнае папялішча. Вось тут, на спакутаваным пляцы перад кафедральным саборам я і прапаную паставіць наш помнік.**



# Аляксей Стрэльнікаў: мора і горы

**«…Мне здаецца, што ў Мінску проста неабходны помнік гарам і мору. Гэта мусіць напамінаць менчукам і беларусам, што недзе ў свеце ёсць мора і горы. Што праз мора чалавек злучаецца з усім сусветам, праз узровень мора ўсе роўныя, але мора дае кожнаму ўсе магчымасці. Што горы даюць магчымасць узняцца на побытавымі праблемамі, што каб стаць бліжэй да неба патрэбны высілкі і мужнасць. Мне здаецца, такі монумент мусіць быць забаўляльным для дзетак, якім будзе дазволена па ім лазіць і мацаць, і даваць астатнім магчымасць проста пасідзець і адпачыць у спёку, а ўзімку падабдзёрваць усіх і нагадваць, што хутка вясна!...».**

